**Г.А.Харытончык**, *дацэнт*

# РАЗВІЦЦЁ Ў СТУДЭНТАЎ НАВЫКАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫХ СРОДКАЎ

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў з'яўляецца асноўнай мэтай кожнай ВНУ. Павышэнне якасці выкладання і эфектыўнасці вучэбнага працэсу прадугледжвае ўкараненне такіх сродкаў і методык, якія дазваляюць стымуляваць самастойнасць, індывідуальнасць навучання і выклікаць цікавасць да вывучаемага прадмета, а таксама развіваць творчыя здольнасці навучэнцаў.

Мэта навучання замежным мовам, як вядома, заключаецца ў авалоданні камунікатыўнай кампетэнцыяй, гэта значыць, маецца на ўвазе не столькі навучанне сістэме мовы, колькі практычнае авалодванне ёю.

У апошні час многія замежныя універсітэты звярнулі ўвагу на магчымасць выкарыстання камп'ютэрных тэлекамунікатыўных тэхналогій для навучання замежным мовам на адлегласці. У цэнтры працэсу навучання знаходзіцца самастойная пазнавальная дзейнасць навучэнца (вучэнне, а не выкладанне). Спецыфікай такой сферы ведаў з'яўляецца самастойная работа па авалоданні рознымі відамі моўнай дзейнасці, фарміраванне неабходных навыкаў і ўменняў.

Пошукі шляхоў эфектыўнага навучання замежным мовам на адлегласці вядуцца ў розных краінах свету. Для гэтых мэт выкарыстоўваюцца не толькі друкаваныя сродкі, але і тэлебачанне, відэазапіс, а ў апошні час – CD-ROM.

Аднак праблема вывучэння замежнай мовы на аснове самаадукацыі, якая не прадугледжвае пастаяннай сувязі з выкладчыкам, з'яўляецца даволі складанай і не заўсёды эфектыўнай.

Без сістэматычнай зваротнай сувязі такая работа не будзе паспяховай. Менавіта таму самыя цікавыя і захапляльныя тэлевізій-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя або камп'ютэрныя навучальныя праграмы самі па сабе, без кіраўніцтва выкладчыка вельмі рэдка з'яўляюцца эфектыўнымі.

Пры дыстанцыйным навучанні студэнт павінен не толькі валодаць навыкамі работы з камп'ютэрам, але і спосабамі работы з аўтэнтычнай інфармацыяй, гэта значыць ён павінен у поўнай меры валодаць рознымі відамі чытання: пошукавым, азнакамляльным, а таксама ўмець карыстацца электроннымі даведнікамі і слоўнікамі.

Навучэнец павінен актыўна займацца пазнавальнай дзейнасцю, якая не абмяжоўваецца авалодваннем ведамі. Прадугледжваецца актыўнае карыстанне імі для рашэння розных камунікатыўных задач у сумеснай творчай дзейнасці ў групах. З гэтай мэтай у курсах замежных моў найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца сумесныя праекты; там, дзе гэта магчыма, з носьбітамі вывучаемай мовы.

Дыстанцыйнае навучанне, якое з'яўляецца па сутнасці індывідуалізаваным, не павінна выключаць магчымасці камунікацыі не толькі з выкладчыкам, але і з іншымі партнёрамі, а таксама сумеснай пазнавальнай і творчай дзейнасці. Праблема сацыялізацыі пры дыстанцыйным навучанні вельмі актуальная, амаль найважнейшая для авалодвання замежнай мовай.

Сістэма кантролю за ведамі і магчымасцю прымяніць іх у розных праблемных сітуацыях павінна быць пастаяннай, сістэматычнай і грунтавацца на аператыўнай зваротнай сувязі.

Асаблівасць прадмета "Замежная мова" заключаецца ў яго дзейнаснай аснове. Кожны навучэнец павінен мець дастатковую практыку ў розных відах моўнай дзейнасці, што фарміруе адпаведныя навыкі. Як паказвае гісторыя развіцця методыкі, вывучэнне замежных моў можа быць эфектыўным пры апоры на: а) слыхаматорныя навыкі, гэта значыць, што ў аснове навучання розным відам моўнай дзейнасці павінны быць вусныя практыкаванні; б) неабходнасць апоры на родную мову, што забяспечвае свядомыя, больш трывалыя веды. Незалежна ад выбранай методыкі вывучэння замежнай мовы навучанне павінна будавацца такім чынам, каб у свядомасці навучэнца фарміравалася сістэма мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мадэлі дыстанцыйнага навучання могуць адрозніваца, але кожная з іх прадугледжвае гібкае спалучэнне самастойнай пазнавальнай дзейнасці навучэнца з рознымі крыніцамі інфармацыі, вучэбнымі матэрыялямі, спецыяльна распрацаванымі па дадзеным курсе; сістэматычнае ўзаемадзеянне з выкладчыкам. Віды самастойнай дзейнасці навучаемых павінны быць разнастайнымі (групавыя, парныя, індывідуальныя).

Такім чынам, для эфектыўнай арганізацыі самастойнага працэсу навучання на адлегласці неабходна ўлічваць наступныя фактары:

– метадычную і тэхналагічную арганізацыю курса навучання;

– дакладнае планаванне работы групы;

– падбор моўнага матэрыялу ў адпаведнасці з мэтамі курса (матэрыял павінен быць арыгінальным);

– сістэматычны кантроль з боку выкладчыка;

– стварэнне і ўтрымліванне станоўчай эмацыянальнай атмасферы ў групе і для кожнага навучэнца індывідуальна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ